28 лістапада 2023 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне дзве паштовыя маркі на тэму «Народныя рамёствы» з серыі «Сумесны выпуск Беларусі і Азербайджана»

Дызайн Марыны Віткоўскай, Гюнэль Іскандэравай.

Маркі друкаваліся ў РУП «Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А.Ц. Непагодзіна».

Маркі друкаваліся таксама ў малым лісце.

Саломапляценне – адно з найстаражытных рамёстваў. Даследчыкі лічаць, што продкі беларусаў пачалі выкарыстоўваць салому як матэрыял для пляцення на мяжы II–I тысячагоддзяў да н. э.

У 2022 годзе беларуская намінацыя «Саломапляценне Беларусі: мастацтва, рамяство, уменні» ўключана ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

Беларускія творы з саломкі не маюць аналагаў у свеце. Захаванне і развіццё саломапляцення – адзін з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці дзяржавы па ахове культурнай спадчыны. Мастацкія вырабы і сувеніры з саломкі асацыююцца з Беларуссю, сведчаць аб творчых здольнасцях і працавітасці беларусаў.

У Азербайджане існавалі асобныя гарады, якія займаліся медным рамяством. Цэнтрам гэтага старажытнага мастацтва стаў Лагіч. Горнае паселішча мае статус дзяржаўнага гісторыка-культурнага запаведніка XIV–XV стагоддзяў, уключанага ў «Вялікі шаўковы шлях».

Традыцыйныя метады вытворчасці медзі ў Лагічы захоўваюцца і сёння. Посуд, выраблены майстрамі Лагіча, упрыгожаны мудрагелістымі і тонкімі ўзорамі. На марцы прадстаўлены сіні (круглы паднос) і сарпуш (вечка, якое захоўвала цяпло стравы).

У 2015 годзе «Меднае мастацтва Лагіча» было ўключана ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Гэта садзейнічае захаванню старажытных культурных традыцый азербайджанскага народа, іх перадачы будучым пакаленням, а таксама сацыяльна-эканамічнаму развіццю старажытнага паселішча.

У дзень выпуску паштовых марак у абарачэнне на паштамце Мінска і ў Баку (Азербайджан) будуць праводзіцца спецыяльныя гашэнні на канверце «Першы дзень».

Source URL: *https://mpt.gov.by/node/8882*